

# «ГЭТА Ж ЗОЛАТА. ТРЭБА ПЕРАПРАЦАВАЦЬ І ПУСЦІЦЬ У СПРАВУ»

**У вытворчасці пелет Прэзідэнт бачыць вялікую перспектыву**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
27 мая АЎТОРАК № 100 (30488)



Фота БелТА.

# ЧАС ІСПЫТАЎ

**По ўсёй краіне стартавала здача ЦЭ і ЦТ**

У панядзелак пачаўся адказны этап для беларускіх абітурыентаў. Для вучняў 11-х класаў, а таксама выпускнікоў мінулых гадоў адначасова стартавалі цэнтралізаваныя выпрабаванні ва ўсіх 144 пунктах правядзення. Здавалася б, толькі ўчора выпускнікі адзначалі «Апошні званок», як прагучаў ужо новы, у дарослае жыццё — запрашэнне на цэнтралізаваны экзамен. Стартавала і цэнтралізаванае тэсціраванне — для выпускнікоў мінулых гадоў і каледжаў. Адказнасць уступнай пары абітурыенты ўсведамляюць цалкам, бо ад яе вынікаў, без перабольшвання, залежыць будучыня маладых людзей. Карэспандэнты «Звязды» на месцах сачылі за першым днём іспытаў.

СТАР. 8–9

ВАЕННАСЛУЖАЧЫЯ ПРЫНЯЛІ ВАЕННУЮ ПРЫСЯГУ 6



ГРОДЗЕНСКІ «НЁМАН» ЗАВАЯВАЎ КУБАК БЕЛАРУСІ ПА ФУТБОЛЕ 16



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25100>

НА СЛЫХУ

# ТАКСІ ВЫЯЗДЖАЕ З ЦЕНЮ

**Сёння таксістаў фіксуецца больш, чым у дарэстравы перыяд**

...Збіраюся ў невялікае падарожжа на малую радзіму. Сумкі цяжкія, таму, каб дабрацца да Цэнтральнага аўтавакзала ў Мінску, вырашаю скарыстацца паслугамі таксі. Афарміла заказ анлайн. Машына прыбыла практычна хвіліна ў хвіліну. Вадзіцель прапанаваў паставіць сумкі ў багажнік, каб мне было камфортней ехаць. Села на задняе сядзенне. «Прышпіліцеся, калі ласка, — папрасіў таксіст. — Так трэба». Паездка прайшла спакойна, без музыкі і размоў — усяго таго, што адцягвае ўвагу таксіста ад кіравання. Калі папрасіла спыніцца ў пэўным месцы, малады чалавек адказаў: «На жаль, тут спыненне забаронена, пад'едзем да найбліжэйшага прыпынка». Патрабаванні кіроўцы я выконвала беспярэчна, таму што яны былі законнымі — і да пасажыра, і да самой перавозкі — камфортнай і бяспечнай. Яшчэ што заўважна — паездкі ў аўтамабілях-таксі сталі таннейшымі.



СТАР. 7

# «ГЭТА Ж ЗОЛАТА. ТРЭБА ПЕРАПРАЦАВАЦЬ

## Якое багацце ляжыць у нас

У суботу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА працаваў у Гомельскай вобласці, у Петрыкаўскім раёне. Камандзіроўка кіраўніка дзяржавы была прысвечана перспектыўнаму кірунку, пра неабходнасць развіцця якога ён неаднойчы гаварыў, — вытворчасці драўняных паліўных гранул (пелет).



Выкарыстанне такога віду паліва — сусветная тэндэнцыя. Штогод у свеце выкарыстоўваецца каля 31 мільёна тон пелет. Экалагічна чыстае паліва можа замяніць вугаль і газ, дровы. У 2024 годзе арганізацыямі Міністэрства лясной гаспадаркі рэалізавана 34,4 тысячы тон пелет (у асноўным на ўнутраны рынак). За 4 месяцы 2025-га — ужо 29,8 тысячы тон, што ў 3,2 раза больш да аналагічнага перыяду мінулага года. І гэта далёка не мяжа.

### «ГЭТА НАША ПЕРСПЕКТЫВА»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што яшчэ некалькі гадоў таму краіне была пастаўлена задача — вырабляць пелеты: адходы, якія прападаюць у лесе, перапрацоўваць, рабіць з іх гранулы і выкарыстоўваць як таннае і экалагічна чыстае паліва. «Мы выкарыстоўваем газ і нафтапрадукты. А нам трэба сваё. Гэта адходы — іх трэба перапрацаваць, і дзе толькі можна абаграваць памяшканні», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прычым, па яго словах, гэта датычыцца не толькі сацыяльных, але і прамысловых аб'ектаў.

«Так, санкцыі па нас ударылі: Еўропа ўсё гэта скупляла па пэўных цэнах, цяпер яны, адурэўшы, стрэлілі сабе ў нагу і гэта не купляюць. Маюць велізарную цану па электраэнергіі, па газе і гэтак далей. Яны ачухаюцца. Яны прыйдуць да нас», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым нічога не перашкаджае беларусам сёння гэтым займацца. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што трэба насельніцтва арыентаваць на выкарыстанне пелет, але з-за даступнасці газу і нафтапрадуктаў, іх прымальнага кошту, няма вострай патрэбы выкарыстоўваць біяпаліва для абагрэву: маўляў, і так усё добра. «Нам трэба гэта развіваць на будучыню. Таму што ў нашых дзяцей таннага газу можа не быць», — заўважыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што пытанне выкарыстання такога віду паліва будзе ў прыярытэце. «Куды падзець тыя адходы? Трэба перапрацаваць у гранулы. І гэта наша перспектыва, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта ж золата. Мы ходзім, топчам яго нагамі, гэтыя горы складаем. Трэба ўсё перапрацаваць і пусціць у справу».

Міністр лясной гаспадаркі Аляксандр Кулік далажыў, што ў Беларусі створаны 64 вытворчасці па выпуску пелет агульнай магутнасцю каля 900 тысяч тон у год. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу зрабіць рэалізацыю пелет рэнтабельнай. «За кошт іншых кірункаў ты выходзіш на рэнтабельную работу. А трэба, каб усе кірункі былі рэнтабельныя. Гэта твая задача, і супакойвацца нельга, — сказаў кіраўнік дзяржавы міністру лясной гаспадаркі. — Трэба глядзець вакол. Ты бачыш, да чаго ўсё ідзе. Санкцыі не вечныя. І, напэўна, у Еўропе паразумнеюць і будуць усё ж такі глядзець на тое, што ім выгадна. Але працаваць трэба і цяпер».

Як растлумачыў Аляксандр Кулік, насельніцтву вельмі выгадна выкарыстоўваць пелеты — яны прапаноўваюцца па 50 рублёў за тону. Але пры ўмове, што ў грамадзян ёсць паліўная кніжка. У цэлым на ацяпляльны сезон трэба каля 3,6 тоны пелет, што будзе каштаваць прыкладна 180 беларускіх рублёў. А пры набыцці катла пад іх частку цаны (40 %, але не больш за 120 базавых велічынь) кампенсуе дзяржава. Плануецца, што сёлета на ўнутраным рынку будзе спажыта звыш 70 тысяч тон пелет (каля 8 % ад агульнай магутнасці вытворчасцяў). «Гэта мала. Трэба падумаць, як нам тут паскарацца. Трэба комплексна паглядзець на гэта пытанне», — даручыў Аляксандр Лукашэнка.

### «ТРЭБА ПАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ СВАЁ»

Аляксандр Лукашэнка не толькі заслухаў даклады аб вытворчасці пелет, але і азнаёміўся з самой вытворчасцю. Дарэчы, гэта экалагічна чысты від паліва, які дае найменшую колькасць попелу. І, што важна, гэта цалкам аднаўляльны рэсурс, бо драўніны і яе адходаў у краіне дастаткова.

Прэзідэнту паказалі ўзоры гатовай прадукцыі дрэваапрацоўкі. На комплексе «Лясkaвічы» высокі ўзровень аўтаматызацыі вытворчасці, што Аляксандр Лукашэнка вельмі станоўча ацаніў. «Трэба, каб мы сапраўды, без жартаў ішлі гэтым шляхам. Каб была максімальная аўтаматызацыя. Тады і працоўныя рэсурсы будуць. Вось 32 чалавекі вызвалілі — гэта паўкалгаса. Вялікая справа», — падкрэсліў ён. Таксама кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на вырабе драўляных дамоў, якія ён прапаноўвае набываць беларусам.

Прэзідэнту прадэманстравалі ўзоры кацельнага абсталявання айчыннай вытворчасці, што працуе на пелетах. Яны зручныя ў выкарыстанні і абслугоўванні. Некаторымі мадэлямі катлоў, якія працуюць на пелетах, можна кіраваць нават з мабільнага тэлефона, што, безумоўна, вельмі зручна. Беларускія вытворцы зрабілі ўніверсальныя мадэлі катлоў, што працуюць на дранцы, пелетах і дровах. Некаторымі мадэлямі можна лёгка ацяпліць невялікі завод, з выкарыстаннем пелет, канешне. Аляксандр Лукашэнка ўважліва цікавіўся аспектамі работы гэтых катлоў, іх магчымасцямі. «Трэба папулярызаваць сваё», — заўважыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы агледзеў кацельню, якая працуе на пелетах. У летні час яе трэба загружаць гэтым драўняным палівам усяго адзін раз на месяц, а зімой — прыкладна раз на тыдзень. Прэзідэнт высока ацаніў убачанае. «Гэта для нас цуд, які валяецца пад






# І ПУСЦІЦЬ У СПРАВУ»

## літаральна пад нагамі

нагамі. І мы з гэтага барахла робім цуд», — адзначыў ён, гаворачы пра вытворчасць пелет. Беларускі лідар звярнуў увагу, што такія кацельні — выдатны варыянт для аграгарадкоў, і даручыў адпрацаваць пытанне па іх пераводзе на такі від паліва.

### «ГЭТА ІМПАРТАНЕЗАЛЕЖНАСЦЬ»

«Пераход на пелеты — гэта не імпартазамяшчэнне, гэта імпартанезалежнасць», — заявіў у размове з журналістамі **міністр лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК**. Ён расказаў, што летась у Беларусі было спажыта 43 тысячы тон пелет. Планка на гэты год — 80 тысяч тон. Па словах міністра, да 2027-га плануецца выйсці на 200 тысяч тон.

Аляксандр Кулік расказаў, што мэтай стварэння пелетных вытворчасцяў стала неабходнасць перапрацоўваць пілавінне. Грошы робяць з таго, што ляжыць пад нагамі, — у самым прамым сэнсе гэтага слова. «У нас за мінулы год з'явілася 680 тысяч кубоў пілавіння ў выніку вытворчасці прадукцыі. На тону пелет трэба 2,5 куба пілавіння. Вось і простая арыфметыка: у сістэме Мінлясгаса былі створаны магутнасці для вытворчасці 200—250 тысяч тон прадукцыі, — адзначыў кіраўнік ведамства. — Адходаў у лесе хопіць. У нас цяпер не запатрабавана 3 млн кубаметраў дрывяной драўніны, якая ляжыць на складах. Таму можна нават павялічваць магутнасці па вытворчасці пелет, калі будзе спажыванне». Аляксандр Кулік расказаў, што за студзень — красавік насельніцтва набыло 250 катлоў на пелетах. За ўвесь мінулы год лічба не перавышала двух дзясяткаў.

**Міністр энергетыкі Дзяніс МАРОЗ** звярнуў увагу, што пелеты — паліва, якое вырабляецца з нацыянальнага прадукту, незалежна ад санкцый і знешніх пастаўшчыкоў. І ў гэтым вялікая перавага. Ён падкрэсліў: у канцэпцыі энергетычнай бяспекі прапісана, што неабходна развіваць мясцовыя віды паліва. Міністр расказаў, што па даручэнні Прэзідэнта энергетычная сістэма развівае гэты кірунак. «Мы падмешваем пелеты ў шчапу, каб павялічыць каларыйнасць паліва і павысіць яго эфектыўнасць. Цяпер мы будуем тры вялікія энергетычныя аб'екты, дзе будуць выкарыстоўвацца катлы на пелетах», — расказаў міністр энергетыкі.

**Намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Віталь КРЭЦКІ** расказаў журналістам, што выкарыстанне мясцовых відаў паліва дазваляе Беларусі замяшчаць 3 мільярды кубаметраў прыроднага газу. Ён прывёў лічбы: з 11 тысяч энергакрыніц у краіне звыш 7 тысяч пераведзена на выкарыстанне мясцовых відаў паліва. З 2010 года на мясцовыя рэсурсы пераведзены і 350 кацельняў, якія працавалі да гэтага на прыродным газе. Як растлумачыў Віталь Крэцкі, па магутнасці гэта супастаўна з работай аднаго блока атамнай электрастанцыі. «Штогадовы аб'ём выкарыстання мясцовых відаў паліва дазваляе нам замяшчаць 3 мільярды кубаметраў прыроднага газу (у год мы спажываем 17 мільярдаў). Нягледзячы на тое, што 40 раёнаў у краіне маюць долю спажывання мясцовых рэсурсаў больш за 70 %, мы на гэтым не спыняемся. На найбліжэйшую пяцігодку запланаваны перавод выключна на пелеты не менш за 125 кацельняў», — расказаў дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці.

### ТРЭБА ПАСКАРАЦЦА Ў ДВА РАЗЫ І НЕ ЗАБЫВАЦЬ АБ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**Другой тэмай камандзіроўкі Прэзідэнта стала сельская гаспадарка. У Ляскавічах Аляксандр Лукашэнка наведаў мясцовы малочнатаварны комплекс.**

Аляксандр Лукашэнка згадаў, што ў пачатку сваёй прэзідэнцкай кар'еры наведваў гэтыя мясціны і гэту гаспадарку. Кіраўнік дзяржавы ўспомніў, што часы тады былі няпростыя, а ў гэтых мясцінах яшчэ хацелі стварыць так званую «Палескую народную рэспубліку» і трэба было знайсці агульную мову з мясцовымі людзьмі, сярод якіх, па яго словах, было і нямала ачумелых. Няпроста было пераканаць месцічаў у тым, што Палессе не можа існаваць і развівацца само па сабе. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што тады яму прапанавалі разам пакасіць траву, што ён выдатна ўмее. І палешукі гэта ацанілі: «Гэна наш!» «Я гэтыя два словы запомніў назаўжды. Гэта было за Прыпяццю», — расказаў Прэзідэнт.

На дадзены момант МТК «Ляскавічы» ААТ «Агра-Ляскавічы» знаходзіцца ў працэсе мадэрнізацыі, за прыклад узяты перадавы досвед ААТ «Парахонскае». Асноўная крыніца выручкі прадпрыемства — рэалізацыя прадукцыі жывёлагадоўлі. Але на сёння гэтай выручкі не хапае для стабільнай работы. Таму галоўная мэта — павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці малака і ўмацаванне кармавой базы прадпрыемства. Для гэтага будуць пабудаваны два кароўнікі па 384 галавы кожны. Пагалоўе будзе павялічана, што дазволіць павысіць аб'ёмы малака, якое рэалізуецца гатункам «экстра», да 100 % і атрымаць дадатковую выручку.

Аляксандр Лукашэнка даручыў паскорыцца з рэалізацыяй намечаных планаў. «Хлопцы, трэба паскарацца ўдвая, калі хочам выжыць. Не паскорымся — будзем целяпацца ў хвасце. Мы ўсё вырабляем, што вырабляе ўвесь свет. Канкурэнцыя шалёная. Таму трэба паскарацца мінімум у два разы», — дадаў ён.

Дэдлайн ад кіраўніка дзяржавы — да новага года. «Мабілізоўвай людзей і запомні: кадры сёння — гэта дысцыпліна. Жалезная павінна быць дысцыпліна. Таму што мы ж хочам па тэхналогіі працаваць і нешта атрымаць», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама пацікавіўся станам кармавой базы ў гаспадарцы. Кіраўніка дзяржавы запэўнілі, што ўсё пад кантролем, кармавыя культуры пасеяны, у аднагадовых і шматгадовых культур добры патэнцыял. Таксама гаспадарка займаецца меліярацыяй. Беларускі лідар прапанаваў пры магчымасці вырошчваць агародніну. На прыкладзе гаспадаркі «Усход», дзе атрымалі рэкордны ўраджай бульбы, ён параіў арганізаваць паліў гэтых культур, тым больш што побач Прыпяць і вялікіх праблем з гэтым быць не павінна, калі нармальна арганізаваць работу. А рэалізацыя гароднiны можа прынесці гаспадарцы дадатковыя грошы. Агульны пасыл ад кіраўніка дзяржавы нязменны — падыходзіць па-гаспадарску. «Палешукі — дысцыплінаваныя людзі, калі з імі працаваць нармальна», — рэзюмаваў беларускі лідар.

### ПАЛЕШУКІ ШАНУЮЦЬ СВАЮ ЗЯМЛЮ

**Віктар ШАЙБАК, генеральны дырэктар РУП «Кіруючая кампанія холдынга «Аграпрамысловы холдынг Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь»** у размове з журналістамі падкрэсліў, што, ствараючы камфортныя ўмовы для жывёлы, трэба найперш думаць аб стварэнні камфортных умоў для людзей.

«Калі мы павялічваем вытворчасць малака і мяса, адпаведна мы павялічваем выручку. Трэба, натуральна, каб прадукцыя прыносіла даход. Дамагчыся максімальнага прыбытку ад вытворчасці дадзенай прадукцыі, атрымаць дабаўленую вартасць і гэтыя грошы ўкласці ў мадэрнізацыю прадпрыемства, у першую чаргу ў аплату працы людзей. Таму што нашы людзі — бясцэнны дар. У сельскай гаспадарцы назіраецца дэфіцыт кадраў, нам трэба прыцягнуць маладых спецыялістаў — вось гэта наша вялікая мэта, якая будзе актуальная для ўсіх сельгаспрадпрыемстваў краіны», — адзначыў ён.

Віктар Шайбак адзначыў, што «Парахонскае» пакуль дасягнула лепшых вынікаў, чым «Агра-Ляскавічы». Але падабенства двух прадпрыемстваў у тым, што кармы, неабходныя для вытворчасці малака і мяса, вырошчваюцца на меліяраваных землях, якія маюць высокую бальнасць. «І сёння стаіць задача атрымаць якасныя травяністыя кармы на меліяраваных землях. Плюс кукуруза, якую сёння вырошчваем на плошчы больш за 1700 гектараў, якая таксама ідзе на кармы. Вось гэта два складнікі падабенства гаспадарак, дзе працуюць руплівыя палешукі, — адзначыў ён. — Палешук — чалавек, які шукае поле. Вось яго знайшоў і на ім працуе. І шануе гэту зямлю. Гэта найлепшыя людзі краіны».

**Кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый НАЗАРАЎ** у размове з журналістамі падвёў вынікі камандзіроўкі беларускага лідара. Што датычыцца дрэваперапрацоўкі, то, па яго словах, актывізуецца выраб драўляных дамоў. Гэта станоўча паўплывае на развіццё сферы турызму, развіваць які на Прыпяці, беларускай Амазонцы, сам бог загадаў. Драўляныя канструкцыі могуць выкарыстоўвацца і пры мадэрнізацыі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, спартыўных аб'ектаў. Юрый Назараў зрабіў акцэнт на тым, што перспектывы ў дрэваапрацоўцы вельмі вялікія. Што датычыцца пелет, то тут усё відавочна: яны простыя ў вытворчасці і выкарыстанні. «Трэба ісці больш рашуча, не чакаць, напрыклад, пакуль той кацёл на дровах зносіцца, а трэба яго мяняць — такія ўкладанні акупяцца хутчэй. А што да катлоў на газе, іх трэба пераводзіць у рэзервовыя. Неабходна максімальна выкарыстоўваць тое, што ёсць у нас, — мясцовыя віды паліва ў выглядзе шчапы ці пелет. А пелеты — гэта ўвогуле панацэя. Калі няма магчымасці падключыць электрычны кацёл ці абагравальны газам, тады і мудрыць не трэба — загрузіў пелеты ў бункер катла — і ўсё. Гэта відавочная перспектыва, улічваючы наш лясны фонд», — падсумаваў Юрый Назараў.

Што датычыцца далейшага развіцця «Агра-Ляскавічы», то, па словах Юрыя Назарава, тут усё зразумела: для таго каб атрымліваць грошы ад рэалізацыі малака і мяса, трэба стварыць умовы для працы людзей, а таксама для ўтрымання жывёлы. І вельмі важнае пытанне — кармавая база. У гэтым кірунку аграрыі працуюць з Палескім інстытутам раслінаводства. Стаўка робіцца на шматгадовыя травы, досвед «Парахонскага» паказаў правільнасць такога выбару.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**
*Ляскавічы.*





## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ СМЕШАННЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2025.Г.002.00107

**Оператор электронной торговой площадки:**
коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», местонахождение: г. Витебск, проезд Гоголя, 5.

**Электронный адрес электронной торговой площадки:**
https://etpvit.by.

**Дата проведения смешанных электронных торгов: 27 июня 2025 г.**

| | |
|---|---|
| **Единый предмет смешанных электронных торгов** **Недвижимое и движимое имущество, находящееся в собственности Витебской области, переданное в безвозмездное пользование ОАО «Завод «ЭВИСТОР» (организатор электронных торгов:** комитет «Витебскоблимущество», 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38, тел. (80212) 653471); **недвижимое имущество, находящееся в собственности открытого акционерного общества «Завод «ЭВИСТОР» (далее – ОАО «Завод «ЭВИСТОР») и иное имущество (организатор электронных торгов:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», местонахождение: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (80212) 246312) | |
| **Недвижимое и движимое имущество, находящееся в собственности Витебской области (далее – государственное имущество)** | **Недвижимое имущество:** капитальное строение с инв. № 200/С-506729 протяженностью 163,8 м, наименование – кабельная линия 10 кВ, назначение – сооружение специализированное энергетики, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, 3090, сеть электроснабжения. Составные части и принадлежности: А-Участок кабельной линии 10 кВ, Б-Участок кабельной линии 10 кВ. **Движимое имущество:** кабельная линия 10 кВ распределительная подстанция РП-17 комплексная трансформаторная подстанция КТП-7 с инв. № 01108/14, кабельная линия 10кВ распределительная подстанция РП-17 комплексная трансформаторная подстанция КТП-7 с инв. № 01108/15, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр. Фрунзе, 81. **Продавец: комитет экономики Витебского областного исполнительного комитета (балансодержатель – ОАО «Завод «ЭВИСТОР» по договору безвозмездного пользования), тел. +375336114046** |
| **Недвижимое имущество (далее – объекты недвижимости ОАО «Завод «ЭВИСТОР») и иное имущество, находящееся в собственности ОАО «Завод «ЭВИСТОР»** | **Недвижимое имущество:** изолированное помещение с инв. № 200/D-187173 общей площадью 59,9 кв. м, назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – трансформаторная подстанция, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-13. **Места общего пользования:** между ИП 3/1 – доля 10/1000, ИП 3/2 – 1/1000, ИП 3/3 – 1/1000, ИП 3/4 – 5/1000, ИП 3/5 – 1/1000, ИП 3/6 – 3/1000, ИП 3/7 – 3/1000, ИП 3/8 – 9/1000, ИП 3/9 – 3/1000, ИП 3/10 – 1/1000, ИП 3/11 – 15/1000, ИП 3/12 – 12/1000, ИП 3/13 – 5/1000, ИП 3/14 – 15/1000, ИП 3/15 – 16/1000, ИП 3/16 – 14/1000, ИП 3/17 – 11/1000, ИП 3/18 – 7/1000, ИП 3/19 – 38/1000, ИП 3/20 – 1/1000, ИП 3/21 – 2/1000, ИП 3/22 – 2/1000, ИП 3/23 – 151/1000, ИП 3/24 – 1/1000, ИП 3/25 – 10/1000, ИП 3/26 – 186/1000, ИП 3/27 – 322/1000, ИП 3/28 – 24/1000, ИП 3/29 – 31/1000, ИП 3/30 – 34/1000, ИП 3/31 – 24/1000, ИП 3/32 – 17/1000, ИП 3/33 – 18/1000, ИП 3/34 – 1/1000, ИП 3/35 – 1/1000 являются помещения: на 1-м этаже – тамбур 38,7 кв. м, вахта 10,2, коридор 360,5, умывальная 18,3, коридор 12,3, 15 туалетов 1,1, лестничная клетка 54,6, коридор 28,5, коридор 12,7, лестничная клетка 49,6, кладовая 6,1, умывальная 6,8, коридор 5,0, подсобное 5,5, 3 туалета 1,3, 6 туалетов 1,4, коридор 7,6, коридор 3,1, туалет 9,1, туалет 6.3, туалет 1,2, кладовая 5,1, умывальная 1.8, коридор 37,5. лестничная клетка 49,4, кладовая 6,4, коридор 9,2, коридор 4,5, умывальная 18,4, коридор 2,6, коридор 70,6, на 2-м этаже – лестничная клетка 56,7, лестничная клетка 55,3, лестничная клетка 56,9, переход 63,8, на 3-м этаже – коридор 44,9, лестничная клетка 56,7, лестничная клетка 55,6, лестничная клетка 56,1. **Оборудование:** трансформаторная подстанция 2КТП-630 с инв. № 2700 в составе: трансформатор ТМ-630/10, 1968 г. в., заводской номер 3953 (1 шт.), трансформатор ТМ-630/10, 1969 г. в., заводской номер 4395 (1 шт.), щит ПРС (пункт распределительный силовой) с инв. № 2204 в составе: ячейка КРУ (РПС 1/1 250 А – 4 шт.) (5 шт.), ячейка КРУ (РЕ19-37-31190-00- 2 шт., АВМ-20С-2000А – 1 шт.) (1 шт.), ячейка КРУ (А3700, 250А – 2 шт.) (1 шт.), РЦПС-20 (3 шт.). **Продавец: ОАО «Завод «ЭВИСТОР», тел. +375336114046** |
| **Условия смешанных электронных торгов:** 1. заключить договоры на снабжение и транспортировку электрической энергии со всеми субабонентами трансформаторной подстанции; 2. в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения и независимой оценки, необходимой для их проведения на расчетные счета, указанные в протоколе торгов; 3. подписать договора купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения торгов; 4. оплатить предмет торгов в порядке и сроки, установленные договорами купли-продажи; 5. оплатить НДС в размере 20 % от цены продажи имущества, находящегося в собственности ОАО «Завод «ЭВИСТОР» | |
| Расходы Продавца на проведение независимой оценки оборудования составляют 787,20 белорусского рубля с учетом НДС, расходы, связанные с изготовлением документации (паспортизация, регистрация) и проведение независимой оценки изолированного помещения составляют 873,52 белорусского рубля с учетом НДС | |
| **Начальная цена предмета смешанных электронных торгов: 48 844,10 бел. руб., в том числе: 1. начальная цена государственного имущества – 5 094,00 бел. руб.; 2. начальная цена недвижимого и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Завод «ЭВИСТОР», – 43 750,10 бел. руб. без учета НДС (20 %)** | |
| **Размер задатка – 4 884,41 бел. руб.** | |
| Задатки для участия в электронных торгах перечисляются с даты публикации данного извещения и по 26 июня 2025 г. включительно на расчетный счет № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Назначение платежа:** ***внесение суммы задатка для участия в торгах*** | |
| **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **26 июня 2025 г. в 16.00** | |
| Консультации по вопросам участия в электронных торгах и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по 26 июня 2025 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Контактные телефоны: (80212 246312, +375295100763, +375295337281). Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время по согласованию с контактным лицом | |

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О проведении электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 608.

**Победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:**

- в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения и независимой оценки, необходимой для их проведения на расчетные счета, указанные в протоколе торгов;
- подписать договоры купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения торгов;
- оплатить предмет торгов в порядке и сроки, установленные договорами купли-продажи;
- оплатить НДС в размере 20 % от цены продажи имущества, находящегося в собственности ОАО «Завод «ЭВИСТОР»;
- заключить договоры на снабжение и транспортировку электрической энергии со всеми субабонентами трансформаторной подстанции.

**Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, vitebsk-region.gov.by, на сайте электронной торговой площадки https://etpvit.by.**




АКЦЭНТЫ

# КІРУНКАЎ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ХАПАЕ

## Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН наведаў з рабочым візітам Татарстан

Урадавая дэлегацыя на чале з Прэм'ер-міністрам Беларусі за адзін дзень наведала тры гарады: Набярэжныя Чаўны, Ніжнякамск і Елабугу.



Фота БелТА.

У рамках візіту прайшлі перагаворы Аляксандра Турчына з **кіраўніком Татарстана Рустамам МІНІХАНАВЫМ**, а таксама адбылося наведванне вядучых прамысловых прадпрыемстваў.

У прыватнасці, кіраўнік беларускага ўрада і лідар Татарстана наведалі ключавое прадпрыемства па выпуску трактароў і спецтэхнікі «МТЗ-Татарстан», дзе з 2010 года сабрана ўжо 24 238 адзінак тэхнікі.

На прадпрыемстве арганізавана вытворчасць трактароў і камунальных машын, аптовы гандаль сельгастэхнікай і запчасткамі, рамонт і сэрвіснае абслугоўванне.

Што датычыцца лакалізацыі вытворчасці, тут вырабляюць нізкапрофільныя кабіны, рукавы высокага ціску, шчыткі прыбораў.

Як расказалі Прэм'ер-міністру падчас візіту, «МТЗ-Татарстан» плануе арганізаваць вытворчасць трактароў «Беларус-1025.4», «Беларус-2022.4», «Беларус-1523.4», «Беларус-1220.4», «Беларус-952.4», якія адпавядаюць экалагічным стандартам не ніжэйшым за ўзровень STAGE-3A, а таксама вытворчасць кабіны, трансмісіі і іншых камплектуючых.

Мэта рэалізацыі інвестыцыйнага праекта — стварэнне новай вытворчасці трактароў для лакалізацыі на рынку Расіі.

Як заявіў журналістам **намеснік міністра прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ** падчас візіту беларускай урадавай дэлегацыі ў Татарстан, «МТЗ-Татарстан» плануе павялічыць аб'ёмы вытворчасці і рэалізацыі тэхнікі.

— Сёння мы развіваем як продажы, так і сэрвіс, гарантыйнае абслугоўванне. Займаемся развіццём сумеснай зборачнай вытворчасці Беларусі і Татарстана. Над гэтай праграмай мы вельмі шчыльна працуем з Мінпрамгандлем Расіі. На сёння ў нас практычна на выхадзе дакументы, якія дазволяць прадукцыі мець статус выраблены ў Расійскай Федэрацыі і павялічыць аб'ём вытворчасці на дадзенай пляцоўцы. На гэтай пляцоўцы можна ў разы павялічваць вытворчасць і рэалізацыю нашай тэхнікі, — выказаў упэўненасць Андрэй Кузняцоў.

Аляксандр Турчын і Рустам Мініханаў наведалі таксама вытворчую пляцоўку КАМАЗ, дзе абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва.

Ключавыя партнёры з беларускага боку — холдынгі «Аўтакампаненты», «МАЗ», «БМК», «БелОМА», а таксама ААТ «МВАВТ» і Мінскі падшыпнікавы завод.

У часткі імпартазамяшчэння прадпрыемствы «Аўтакампанентаў» ужо распрацавалі і запусцілі вытворчасць 17 новых вырабаў для КАМАЗ.

Што датычыцца сумесных распрацовак з МАЗам, то гэта стварэнне двухконтурнага рулявога механізму, сістэмы курсавой устойлівасці, дыскавых тармазных механізмаў і тармазных камер, сістэмы кіравання пнеўмападвескай і сучасныя рашэнні ў счапленні.

Такое партнёрства дазваляе ўмацоўваць тэхналагічную незалежнасць і адкрываць новыя магчымасці для абодвух вытворцаў.

Дарэчы, падчас наведвання прадпрыемства Аляксандр Турчын пратэсціраваў КАМАЗ-5491 — грузавік самага апошняга пакалення К5.

На сустрэчы з кіраўніком Татарстана Рустамам Мініханавым Аляксандр Турчын назваў ключавыя кірункі супрацоўніцтва з гэтай рэспублікай, у ліку якіх машынабудаванне, нафтахімічны комплекс, грамадзянскае авіябудаванне.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў той факт, што даныя па ўзаемным гандлі сведчаць аб добрым узроўні ўзаемадзеяння. Ён адзначыў, што ўбачанае на прадпрыемствах гаворыць аб адносінах, якія дынамічна развіваюцца, але тым не менш бачныя новыя сферы ўзаемнага супрацоўніцтва:

— Асноўныя кірункі — машынабудаванне (вельмі шмат сумесных перспектыў), бачны патэнцыял у нафтахіміі і спадарожных сферах (я вельмі прыемна здзіўлены кампаніяй «Татнафта»), грамадзянскае авіябудаванне. Таму шмат кірункаў (ёсць. — **Заўв. аўт.**), куды нам рухацца.

Аляксандр Турчын запэўніў, што пры неабходнасці рашэнні, якія трэба будзе прымаць на ўзроўні ўрада, будуць прыняты.

Што датычыцца адукацыйнага трэка, ён адзначыў: бакам трэба больш інтэнсіўна папрацаваць, асабліва ў тых кірунках, дзе ёсць істотныя напрацоўкі.

Культурны складнік таксама развіваецца:

> **— Абаротаў дакладна нам змяншаць у гэтым кірунку не варта, — выказаў упэўненасць Аляксандр Турчын і падзякаваў кіраўніку Рэспублікі Татарстан за падрабязнае абмеркаванне парадку дня цяперашняга рабочага візіту. — У мяне ёсць упэўненасць, што ў нас яшчэ вельмі шмат кірункаў, якія мы можам развіваць, павялічваючы ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва.**

Адказваючы на пытанні журналістаў, Аляксандр Турчын адзначыў, што лічбы ўзаемнага гандлю сведчаць аб збалансаванасці тавараабароту.

— Сума тавараў, якія мы пастаўляем у Татарстан і якія імпартуем з Татарстана, практычна аднолькавая, значыць мы вельмі нядрэнна дапаўняем адно аднаго, — зрабіў высновы Прэм'ер-міністр.

Трэба дадаць, што ў рамках візіту Беларусь і Татарстан дамовіліся аб новым фармаце двухбаковай работы.

Як падкрэсліў Аляксандр Турчын, цяпер штомесяц рабочы групы пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ераў будуць сустракацца ў розных фарматах, а адзін раз у тры месяцы вынікі іх дзейнасці будуць аналізаваць на ўзроўні Прэм'ер-міністра Беларусі і Раіса Татарстана.

— Адпаведна, ці то заахвочваючы, ці то лаючы нашых кіраўнікоў, — з доляй гумару рэзюмаваў Аляксандр Турчын.

У сваю чаргу кіраўнік Татарстана Рустам Мініханаў падкрэсліў, што разлічвае наведаць Беларусь па запрашэнні беларускага Прэм'ер-міністра праз тры месяцы.

— У нас вялікая гісторыя (супрацоўніцтва. — **Заўв. аўт.**), нашы прамыслоўцы добра адзін аднаго ведаюць. Нам трэба раскрыць новыя інтарэсы для нашых бакоў, — падкрэсліў Рустам Мініханаў. — Мы дзякуючы добрым асабістым кантактам нашых лідараў маем магчымасць вельмі прадукцыйна працаваць. Але гэты давер трэба яшчэ апраўдаць.

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НОВЫ ІМПУЛЬС СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў РОЗНЫХ СФЕРАХ

## Беларусі і Егіпту ёсць куды рухацца ў развіцці гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння

Гэтымі днямі дэлегацыя Палаты прадстаўнікоў на чале з Ігарам СЕРГЯЕНКАМ знаходзіцца з афіцыйным візітам у Егіпце. Галоўная мэта візіту — актывізацыя міжпарламенцкага і гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння паміж нашымі краінамі.



Фота ТГ-канала Палаты прадстаўнікоў.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка правёў перагаворы са **старшынёй Федэрацыі егіпецкіх гандлёвых палат Ахмедам эль-Вакілем.** На парадку дня — магчымасці гандлёва-эканамічнага партнёрства Беларусі і Егіпта, інвестыцыйная прывабнасць нашай краіны і яе патэнцыял для вядзення бізнесу.

У лютым 2020 года, калі кіраўнікі Беларусі і Егіпта сустракаліся ў Каіры, асноўная ўвага была аддадзена менавіта гандлёва-эканамічным сувязям. У красавіку 2024-га падчас афіцыйнага візіту ўрадавай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Егіпет было падпісана міжурадавае пагадненне аб сістэме садзейнічання ўзаемнаму гандлю. У пачатку гэтага года яго аператыўна ратыфікавалі беларускія парламентарыі.

«Сістэма садзейнічання гандлю прадугледжвае шэраг пераваг для ўдзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці краін, якія заключылі такое пагадненне. Напрыклад: прыярытэтны парадак здзяйснення мытных аперацый, спрашчэнне мытных фармальнасцяў, непрымяненне мытнага нагляду ў пунктах пропуску, за выключэннем асобных выпадкаў выяўлення высокай рызыкі парушэнняў. Кажу пра гэта, каб падкрэсліць, што парламентарыі не стаяць у баку ад жыцця. Сёння мы знаходзімся тут менавіта для таго, каб надаць новы імпульс беларуска-егіпецкаму супрацоўніцтву ў розных галінах», — заявіў Ігар Сергяенка.

Спікер падкрэсліў, што значным вынікам візіту стане падпісанне шэрага ўзаемавыгадных пагадненняў. «Нам ёсць куды расці. Толькі ў таварнай структуры беларускага экспарту налічваецца больш за 1100 таварных пазіцый. Вось чаму з дзейнасцю гандлёвых палат Беларусі і Егіпта мы звязваем вялікія спадзяванні», — падкрэсліў ён. Гаворачы аб развіцці гандлёва-эканамічных сувязяў, Ігар Сергяенка паведаміў старшыні Федэрацыі егіпецкіх гандлёвых палат Ахмеду эль-Вакілю, што летась у Беларусі быў прыняты закон «Аб інвестыцыях». У яго аснове — стварэнне спрыяльных умоў для інвесціравання і паляпшэння бізнес-асяроддзя.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў запрасіў егіпецкіх бізнесменаў прыняць удзел у міжнародных выставах — Міжнародным форуме па штучным інтэлекце (13—14 чэрвеня) і «Белагра» (3—7 чэрвеня). Ігар Сергяенка акцэнтаваў увагу на тым, што сёння Беларусь — гэта не толькі ўсім вядомыя брэнды, як МТЗ, МАЗ або «Амкадор». У нашай краіне ёсць моцныя кампаніі, якія ў сваіх нішах займаюць лідарскае становішча на сусветным рынку. Вынікі іх дзейнасці шырока выкарыстоўваюцца за мяжой. У прыклад ён прывёў такія кампаніі, як «Рэгула», «Салар Лазерныя сістэмы» і іншыя. Ігар Сергяенка, кажучы пра харчовую бяспеку, адзначыў, што беларуская сельгаспрадукцыя экспартуецца ў больш чым сто дзяржаў свету.

Спікер Палаты прадстаўнікоў зрабіў акцэнт на тым, што магчымасці гандлёва-эканамічнага партнёрства Беларусі і Егіпта вялікія і пакуль не да канца запатрабаваныя. «Перакананы, што калі ў працэсе далейшага развіцця беларуска-егіпецкіх адносін мы аб'яднаем нашы патэнцыялы, то вынікі не прымусяць сябе чакаць. Для гэтага ў нас ёсць галоўнае — палітычная воля і ўзаемнае жаданне развіваць адносіны», — рэзюмаваў Ігар Сергяенка.

Дэлегацыя беларускіх парламентарыяў наведала новую адміністрацыйную сталіцу Егіпта. У гэтым маштабным праекце таксама бачацца магчымасці пашырэння ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі.

Таксама Ігар Сергяенка правёў сустрэчы са сваім калегам − Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Арабскай Рэспублікі Егіпет Ханафі Алі аль-Гебалі.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

# РЭКОРДНЫ MILEX

## Сума кантрактаў перавысіла 390 мільёнаў долараў

Выстаўка MILEX-2025, якая праходзіла на мінулым тыдні, чарговы раз пацвердзіла статус найважнейшай пляцоўкі для дэманстрацыі дасягненняў ваенна-прамысловага комплексу і ўмацавання стратэгічнага партнёрства. Яе ўдзельнікамі сталі 150 кампаній з Беларусі, прадстаўнікі Індыі, Ірана, Кітая, Пакістана і Расіі, а таксама афіцыйныя дэлегацыі амаль з 30 краін. Падчас работы выстаўкі яны абмеркавалі ўвесь спектр актуальных праблем, якія стаіць перад зброевай галіной і навуковай супольнасцю.

Паводле слоў старшыні Дзяржкамваенпрама Дзмітрыя Пантуса, у параўнанні з папярэдняй выстаўкай у 2023 годзе мерапрыемства істотна прырасло па колькасці прадстаўленых на ім кампаній і сум падпісаных кантрактаў. Агульная сума падпісаных пагадненняў перавысіла 390 млн долараў, расказаў Дзмітрый Пантус у інтэрв'ю тэлеканалу «Першы інфармацыйны».

«Мы пабілі рэкорд мінулай выстаўкі MILEX, калі ў нас было кантрактаў на 277 млн долараў, — адзначыў ён. — Вельмі шчыльна працуем з Расійскай Федэрацыяй, кааперацыйныя сувязі дасягнулі свайго апагею, і сёння ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі знаходзіцца на своеасаблівым максімуме. Ніводны выраб Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь без сумесных паставак не абыходзіцца. І мы ўжо нават не лічым гэта за замежны прадукт. Шмат рэалізоўваецца сумесных доследна-канструктарскіх работ».

Дзмітрый Пантус звярнуў увагу, што паміж краінамі сёння завяршаецца фарміраванне праграмы па ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве да 2030 года. Нягледзячы на ціск і санкцыі, плённае ўзаемадзеянне ў абароннай прамысловасці працягваецца, а сама сфера актыўна развіваецца. «Шмат работы праведзена для таго, каб мы адчувалі сябе ўпэўнена, — дадаў ён. — І мы адчуваем сябе ўпэўнена — гэта вынік сапраўднай і шчырай сумеснай дзейнасці».

**Паводле БелТА.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2, www.cpo.by |
| **Продавец** | ООО «Пассат», г. Солигорск, Минская обл., Солигорский р-н, Чижевичский с/с, Метявичское шоссе, 5Б-1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Административный корпус 3** (здание административно-хозяйственное), инв. № 342/С-13111, общ. пл. **1 103,1** кв. м, адрес: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Зелёная, 10

***Составные части и принадлежности:*** подвал.
***Земельный участок*** общ. пл. 0,1031 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и содержания административного здания

**Начальная цена – 314 706,70 бел. руб.** (с НДС 20 %).
Шаг аукциона: **5 %** от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X. УНП 191 021 390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **5 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 17.04.2025

**Дата и время начала и окончания торгов: 26.06.2025 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема документов: заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **25.06.2025 до 17.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

| № п/п | Инв. № | Наименование предмета электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 6076/1 | **Разбрасыватель минеральных удобрений РМУ-8000**, 2012 г. в., расположенный по адресу: Гродненская область, Лидский р-н, д. Далекие | 17 280,00 |
| 2 | 5183 | **Сеялка AMAZONE AVANT**, 2002 г. в., расположенная по адресу: Гродненская область, Лидский р-н, а/г Крупово | 60 240,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после электронных торгов

**Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) рабочих** дней с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 6 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Извещение о проведении открытого аукциона
на право заключения договоров аренды нежилых помещений

Организатор аукциона –
**РУП «Белтелеком»**
**в лице Брестского филиала,**
расположенного по адресу: г. Брест, пр-т Машерова, 21-2.

На аукцион выставляется право заключения договоров аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

**Лот 1:** Помещение на 2-м этаже в капитальном строении (здании АТС-47) площадью 477,5 кв. м по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:
1.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:
1БАВ * 0,25 * 477,5 = 119,375 БАВ.

**Лот 2:** Помещение на 2-м этаже в капитальном строении (здании АТС-47) площадью 17,9 кв. м по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:
2.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка:
1БАВ * 0,25 * 17,9 = 4,475 БАВ.

**Лот 3:** Помещение на 2-м этаже в капитальном строении (здании АТС-47) площадью 16,8 кв. м по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:
3.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка:
1БАВ * 0,25 * 16,8 = 4,2 БАВ.

**Лот 4:** Помещения на 2-м этаже в капитальном строении (здании АТС-47) площадью 11,3 кв. м по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:
4.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:
1БАВ * 0,25 * 11,3 = 2,825 БАВ.

**Лот 5:** Помещение на 2-м этаже в капитальном строении (здании АТС-47) площадью 16,8 кв. м по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:
5.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:
1БАВ * 0,25 * 16,8 = 4,2 БАВ.

**Лот 6:** Помещения со вспомогательной площадью на 1-м этаже в капитальном строении (здании подстанции) площадью 78,4 кв. м по ул. Энтузиастов, д. 66А в г. Барановичи Брестской области:
6.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:
1БАВ * 0,25 * 78,4 = 19,6 БАВ.

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права и задатка согласно п. 7.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 16.05.2023 №138; коэффициент – 2,5, целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Аукцион состоится **17 июня 2025 года в 12.00** по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».

Документы на участие в аукционе принимаются **с 28 мая 2025 года по 16 июня 2025 года** в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030 г. Брест, пр-т Машерова, 21-2, каб. № 416.

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:
- перечисляет задаток на р/с Брестского филиала РУП «Белтелеком» № BY26AKBB30121001100011000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» (BIC)-AKBBBY2X, УНП 201003265;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:
- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Победителем аукциона признается участник**, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

**Победитель аукциона** (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан:**
1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;
2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;
3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей:
– подписания протокола о результатах аукциона;
– оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды;
– возмещения затрат на организацию и проведение аукциона;
– заключения договора аренды – **уплачивается штраф** в размере 50 базовых величин.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Телефон для справок: (8-0162) 22-10-20,тел./факс 22-15-42.**

СЛУЖУ АЙЧЫНЕ!

# НЕ ТОЛЬКІ СВЯТЫ АБАВЯЗАК...

**Ваеннаслужачыя новага папаўнення прынялі ваенную прысягу**



24 мая ў злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл краіны было асабліва шматлюдна. Тут прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя прынясенню ваеннай прысягі новым папаўненнем. У гэты дзень клятву на вернасць народу прынеслі каля 8 000 ваеннаслужачых, прызваных на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве.

З іх — больш за 2 500 чалавек — у 72-м гвардзейскім аб'яднаным навучальным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў. У найбуйнейшым навучальным злучэнні Узброеных Сіл ва ўрачыстых мерапрыемствах узяў удзел міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар Хрэнін. Карэспандэнты «Звязды» разам з роднымі і блізкімі навабранцаў сталі сведкамі ўрачыстага воінскага рытуалу.

## ЗАХАВАЦЬ ГАЛОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

«Сёлета мы адзначаем знамянальны юбілей — 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Нашы дзяды і прадзеды адстаялі свабоду нашай Радзімы і падарылі нам мір. Памяць аб іх подзвігу жыве ў нашых сэрцах і справах. Сёння мы з вамі працягваем эстафету па абароне суверэнітэту і незалежнасці Беларусі ў сучасных няпростых умовах», — звярнуўся да прысутных **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН.**

Як адзначыў кіраўнік ваеннага ведамства, нягледзячы на напружаную абстаноўку каля нашых граніц, у краіне надзейна забяспечаны мір, стабільнасць і бяспека — галоўныя каштоўнасці беларускага народа: «Немалая заслуга ў гэтым належыць Узброеным Сілам. Яны аснашчаны сучаснымі ўзорамі ўзбраення і ваеннай тэхнікі, у іх створаны аптымальныя ўмовы для паўсядзённага жыцця і службы, бо галоўнае ў арміі — гэта людзі. Тыя, хто сёння выконвае вучэбна-баявыя задачы, хто нясе баявое дзяжурства, забяспечваючы мірную працу грамадзян краіны».



У размове з журналістамі міністр абароны расказаў пра тое, што належыць асвоіць навабранцам падчас службы ў арміі: «Для большасці сённяшніх навабранцаў гэта ўжо першы сур'ёзны крок у самастойнае жыццё. Ім давядзецца пераасэнсаваць каштоўнасці, загартоўвацца фізічна, набыць сяброў, асвоіць новыя ўзоры тэхнікі, якія сёння актыўна паступаюць ва Узброеныя Сілы. Літаральна на наступным тыдні да нас паступіць на ўзбраенне сучасны самалёт Су-30СМ2. Верталёты Мі-35, БТР-82А, тэхніка радыёэлектроннай барацьбы, беспілотныя авіяцыйныя комплексы таксама з'явяцца ў нас. І «Беркут-3», і «Арлан» — гэта ўсё трэба будзе нашым навабранцам вывучыць і навучыцца прымяняць на практыцы».

Генерал-лейтэнант Віктар Хрэнін анансаваў: «Сёлета мы будзем праводзіць вучэнне «Захад-2025», вучэнні па лініі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Пройдзе вялікая колькасць розных праверак, палявых выхадаў, баявой вучобы — усё гэта ляжа на плечы нашых прызыўнікоў. ».

## «КОЖНЫ МУЖЧЫНА ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ, ЯК АБАРАНІЦЬ СВАЮ РАДЗІМУ»

Сярод тых, хто сёння прысягнуў на вернасць Радзіме, — **гвардыі радавы Раман Круцько** з горада Паставы Віцебскай вобласці. Яго **мама Анастасія Падпратава** падзялілася сваімі перажываннямі з прэсай: «Эмоцыі неапісальныя, вельмі хвалююся, але спадзяюся, што адслужыць годна і ўсё будзе добра. Майму малодшаму сыну сёлета спаўняецца 7 гадоў. Некалі і яго будзем адпраўляць на службу. Я паказвала яму фатаграфію старэйшага брата, дык той яго нават не пазнаў. «Гэта што, наш Рома?! Крута!» — такая была рэакцыя ў малодшага сына. Ён сказаў: «Мам, я таксама абавязкова стану ваенным, буду такім прыгожым і моцным». І я на гэта вельмі спадзяюся. Шчыра ганаруся тым, што мой старэйшы сын цяпер — сапраўдны абаронца, мая апора і падтрымка».

Наваспечаны абаронца Айчыны гвардыі радавы Раман Круцько прызнаўся, што спачатку перажываў: «Але ўсё атрымалася! Гэты месяц прайшоў вельмі хутка, і мне сапраўды падабаецца служыць. Асабліва спадабаліся заняткі па агнявой падрыхтоўцы».

**Святлана Каросцік** з Барысава прыехала на цырымонію прынясення ваеннай прысягі, каб падтрымаць сына Сямёна. «Кожны мужчына павінен ведаць, як абараніць сваю Радзіму, каб, калі спатрэбіцца, своечасова стаць на яе абарону і выканаць свой абавязак», — лічыць яна.



Сын жанчыны, **гвардыі радавы Сямён Каросцік,** падкрэсліў: служыць у арміі зусім не страшна. Ваеннаслужачы новага папаўнення развеяў міф пра дзедаўшчыну ў арміі: «Яе няма і быць не можа. У нашым падраздзяленні пануе атмасфера ўзаемадапамогі і ўзаемаразумення. Камандзіры адказна сочаць за дысцыплінай, заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу па любым пытанні. Перакананы, што прайсці праз армейскую школу павінен кожны, бо ўмець у выпадку чаго абараняць нашу Радзіму — наша агульная мэта і задача». Дарэчы, гвардыі радавому Сямёну Каросціку служыць усяго год. За плячыма ваеннаслужачага — вучоба ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, работа ў IT-сферы. Ён перакананы: служба ў арміі — важны складнік у жыцці кожнага маладога чалавека. Яна загартоўвае характар, фарміруе сапраўдныя мужчынскія якасці.

Для **гвардыі радавога Ільы Менца** з Мінска дзень прынясення ваеннай прысягі дакладна запомніцца назаўжды. Ва ўрачыстай абстаноўцы, на вачах тысяч чалавек ён зрабіў прапанову сваёй дзяўчыне Валерыі. Ваеннаслужачы новага папаўнення падзяліўся ўражаннямі ад гэтага важнага дня: «Ідэя зрабіць прапанову ў дзень прынясення прысягі з'явілася яшчэ да таго, як прызвалі ў армію. З Лерай мы знаёмыя ўжо тры гады, з іх паўтара — разам. Упэўнены, што разам мы зможам прайсці праз любыя нягоды. Яна абавязкова дачакаецца мяне, і тады мы створым вялікую сям'ю!»

Падтрымаць ваеннаслужачага прыехалі самыя блізкія: бабуля і сястра. Яны таксама падзяліліся сваімі ўражаннямі. «Адчуваю сябе на сёмым небе ад шчасця!» — захапляецца **бабуля навабранца Марыя Менц.** Жанчына прызналася: яе самая вялікая мара, каб унук Ілья стаў сапраўдным абаронцам краіны, каб над намі заўсёды было светлае, чыстае неба.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ТАКСІ ВЫЯЗДЖАЕ З ЦЕНЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Пра тое, што яшчэ змянілася ў сферы нерэгулярных перавозак пасажыраў з увядзеннем рэестра, расказвае **намеснік начальніка Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Дзмітрый КУЛІКОЎСКІ**.

— Як вядома, у адпаведнасці з указам Прэзідэнта і пастановай Савета Міністраў, унутрырэспубліканскія перавозкі пасажыраў у нерэгулярных зносінах, уключаючы таксі, сёння ажыццяўляюцца толькі пры наяўнасці інфармацыі аб дыспетчарах, перавозчыках, транспартных сродках і кіроўцах у рэестры аўтамабільных перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах. Парушэнне гэтых правіл можа прывесці да прыпынення знаходжання ў рэестры і, адпаведна, ускладніць дзейнасць перавозчыкаў, — нагадаў ён.

***— Зыходзячы з таго, што кіроўцаў у рэестры прыкметна дадалося, колькасць таксістаў, гатовых рызыкаваць, таксама зменшылася?***

— Па стане на 21 мая ў рэестр уключаны 143 дыспетчары, 34 391 кіроўца, 24 842 аўтамабілі таксі і 5300 перавозчыкаў. Пра што кажуць гэтыя лічбы? Пасля ўвядзення рэестра асноўная маса аўтамабільных перавозчыкаў выйшла з ценю. Адпаведна скарацілася колькасць парушэнняў. Таму ўжо сёння можна сказаць, што існаванне рэестра даказала сваю абгрунтаванасць, — канстатуе суразмоўца.

Рынак таксі стаў празрыстым. Створаны роўныя ўмовы вядзення бізнесу для ўсіх яго ўдзельнікаў. І гэты факт пацвярджае бізнес-супольнасць. Паводле слоў намесніка начальніка Транспартнай інспекцыі, колькасць перададзеных дыспетчарамі заказаў на перавозку пасажыраў значна вырасла ў параўнанні з аналагічным перыядам двух папярэдніх гадоў.

— Адзначаецца рост выручкі перавозчыкаў і, як вынік, паступленняў у бюджэт, — падсумоўвае Дзмітрый Кулікоўскі.

Даныя з рэестра дазваляюць дыспетчарам у рэжыме анлайн перакanaцца у адпаведнасці паслугі, што аказваецца, патрабаванням бяспекі і не перадаваць заказы перавозчыкам і кіроўцам, якія парушаюць заканадаўства.

— Што датычыцца кошту паездак — ён практычна дасягнуў дарэестравага ўзроўню. Сёння ў цэлым цэнавую сітуацыю на рынку аўтаперавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах можна характарызаваць як стабільную, — каментуе прадстаўнік Транспартнай інспекцыі.

***— Як рэестр змяніў работу таксістаў?***

— Мы ўжо не раз казалі пра тое, што ўвядзенне рэестравай сістэмы не прадугледжвае дадатковых патрабаванняў да кіроўцаў: каб быць уключаным туды, дастаткова выконваць нормы заканадаўства, якія дзейнічалі раней. Так яно і атрымалася. Новаўвядзенні былі неабходныя, каб зрабіць гэты рынак не толькі празрыстым, але і бяспечным. Дыспетчар, які перадае заказы на выкананне перавозак, з уступленнем у сілу Указа № 32, можа вызначаць, наколькі перавозчык у асобе канкрэтнага суб'екта гаспадарання, яго транспартны сродак і кіроўца адпавядаюць патрабаванням заканадаўства, ці змогуць яны выканаць перавозку без парушэнняў, — адзначыў суразмоўца.

— У нашай краіне дзейнічае Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў», згодна з якім любая паслуга павінна адпавядаць патрабаванням бяспекі. Раней такой магчымасці ў дыспетчарскіх службаў не было, — дадае Дзмітрый Кулікоўскі. — Сёння ж дыспетчар, маючы інфармацыю аб перавозчыку і кіроўцу, можа спрагназаваць, наколькі якасна будзе аказана паслуга. Кожны пасажыр таксама можа знайсці для сябе патрэбныя звесткі ў рэестры (ці ёсць там кіроўца і канкрэтны транспартны сродак) і самастойна вызначыць, наколькі бяспечную паслугу яму аказваюць. Акрамя таго, знаходжанне ў рэестры — гарантыя, што аўтамабіль прайшоў дзяржаўны тэхнічны агляд, у прадпрыемства ёсць дагавор страхавання грамадзянскай адказнасці перавозчыка перад пасажырамі, у кіроўцы — адпаведная кваліфікацыя. А таксама тое, што на працу ён выязджае здаровым і на спраўным аўтамабілі.

***— А што кажуць пасажыры?***

— Аналіз зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб — наша пастаянная работа, — падкрэслівае Дзмітрый Кулікоўскі. — І ён сведчыць, што праблемных пытанняў, звязаных з недахопам аўтамабіляў таксі і іх кіроўцаў, няма. Наадварот, мы назіраем станоўчую дынаміку напаўнення рэестра. А гэта сведчыць пра тое, што ўсе прароцтвы аднаго вядомага перавозчыка пра тое, што кіроўцы з увядзеннем рэестра будуць масава сыходзіць з гэтага рынку, на самай справе нічога агульнага з рэчаіснасцю не маюць.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

ВАРТА ВЕДАЦЬ

# НАГРУЗКА ПА СЕЗОНЕ

## На рэспубліканскіх дарогах Беларусі з 26 мая пачалі дзейнічаць сезонныя абмежаванні

У краіне ўведзены часовыя абмежаванні нагрузак на восі транспартных сродкаў, самаходных машын пры праездзе па рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах агульнага карыстання з асфальтабетонным пакрыццём, паведамляе прэс-служба Міністэрства транспарту і камунікацый.




У ведамстве нагадалі, што абмежаванні будуць дзейнічаць да 31 жніўня ў дзённы час сутак з 11.00 да 20.00 пры тэмпературы паветра вышэй за 25 °С. Сезонныя абмежаванні ўводзяцца ў адпаведнасці з пастановай Мінтранса ад 26 красавіка 2025 года № 36 «Аб увядзенні ў 2025 годзе часовых абмежаванняў нагрузак на восі транспартных сродкаў, самаходных машын». Дакумент змяшчае пералік выключэнняў, на якія для ўстойлівага функцыянавання транспартнай галіны гэтыя абмежаванні не распаўсюджваюцца. Сярод іх — платныя дарогі агульнага карыстання (іх участкі). Таксама сярод выключэнняў шэраг транспартных сродкаў і самаходных машын, напрыклад тых, што ажыццяўляюць пасажырскія перавозкі.


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродногазстройизоляция»**

**Аукцион состоится 27.06.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | Лот № 1: Полуприцеп платформа тентовая KRONE SPD 27, 2010 года выпуска, VIN: WKESD000000383660, рег. знак А 9026 В-4, допустимая полная масса 36000 кг. Местонахождение автомобиля: Гродненская область, г.п. Новоельня, ул. Заводская, 7 |
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1** – 19 440 р. (девятнадцать тысяч четыреста сорок рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1 –** 1 944 р. (одна тысяча девятьсот сорок четыре рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 25.06.2025 г. до 15.00** |

**Условия проведения аукциона:**
1. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи.
2. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по независимой оценке объекта продажи в размере 249,78 р. с НДС за оценку 1 единицы техники

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Частное предприятие «ВитаСтройТранс», УНП 290506395, Брестская область, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 79-А |

**Предмет электронных торгов**
**Производственная база, реализуемая одним лотом** (инв. номера капитальных строений 110/С-92605, 110/С-92608, 110/С-92610, 110/С-92611, 110/С-92612, 110/С-107586, 110/С-109729).
**Месторасположение:** Брестская обл., г. Барановичи, ул. Вильчковского, 79А

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 141000000001002081**: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы общей площадью 1,1293 га.
Подробный перечень капитальных строений, входящий в состав лота, размещен на сайте организатора аукциона ИПМ-Торги (www.ipmtorgi.by)

| | |
|---|---|
| **Начальная цена (без НДС)** | **1 995 000,00 бел. руб. (снижена на 5 %)** |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB301200 48350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.04.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 25.06.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.06.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

neo bank

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## 31 марта 2025 г.

**Наименование банка: ЗАО «Нео Банк Азия»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 25 601 | 28 172 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 45 812 | 50 870 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 55 161 | 49 877 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 97 552 | 111 252 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 291 369 | 293 887 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 17 960 | 17 228 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 546 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 4 300 | 2 765 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 4 613 | 5 078 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 542 914 | 559 129 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 45 772 | 44 176 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 417 476 | 433 680 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 6 315 | 8 046 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 4 050 | 4 699 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 473 613 | 490 601 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 24 747 | 24 747 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 2 230 | 1 917 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 11 866 | 11 868 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 30 458 | 29 996 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 69 301 | 68 528 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 542 914 | 559 129 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## 31 марта 2025 г.

**Наименование банка: ЗАО «Нео Банк Азия»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2025 | 31.03.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 10 874 | 8 745 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 7 746 | 4 402 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 3 128 | 4 343 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 893 | 2 653 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 286 | 303 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 607 | 2 350 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (11) | 6 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 947 | 1 497 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 1 052 | (338) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 598 | 1 678 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7 116 | 7 148 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 159 | 105 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 942 | 2 959 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 169 | 732 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 773 | 2 227 |

Председатель Правления Титов А.М.

Главный бухгалтер Сенько С.Е.

Дата подписания: 01 апреля 2025 г.

УНП 807000071


# ЧАС ІСПЫТАЎ

## «НІЯКІХ СЮРПРЫЗАЎ НЕ ЧАКАЕЦЦА»

**Паглядзелі на арганізацыю экзамену ў БДПУ**

У БДПУ імя М. Танка яблыку няма дзе ўпасці. Вядучая педагагічная ВНУ краіны расчыніла свае гасцінныя дзверы для амаль дзвюх тысяч школьнікаў! Тут маладыя людзі на выбар здавалі фізіку, матэматыку, хімію, біялогію, замежную мову, гісторыю Беларусі, грамадазнаўства, геаграфію і сусветную гісторыю. З арганізацыяй правядзення цэнтралізаванага экзамену ў БДПУ азнаёмілася намеснік Прэм'ер-міністра Наталля Пяткевіч.

Цэнтралізаваны экзамен цалкам карэляваны з праграмай агульнаадукацыйнай школы, і ніякіх сюрпрызаў у гэтай частцы не чакаецца. Пра гэта перад пачаткам правядзення цэнтралізаванага экзамену заявіў **намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Андрэй СТРЫГЕЛЬСКІ:** «Сёння адказны дзень для ўсіх выпускнікоў краіны, у тым ліку і для сталічных. На базе 10 пунктаў здаецца цэнтралізаваны экзамен. 12 800 выпускнікоў мінскіх школ і гімназій сёння пройдуць выпрабаванні ў форме цэнтралізаванага экзамену. Гэтаму папярэднічаў сур'ёзны перыяд падрыхтоўкі: была і рэпетыцыя цэнтралізаванага экзамену, і ў сваіх установах адукацыі ажыццяўлялася падрыхтоўка. Указам кіраўніка дзяржавы створана Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам арганізацыі ўступнай кампаніі. Я з'яўляюся членам і адначасова старшынёй гэтай камісіі ў БДПУ. Тут здаюць цэнтралізаваны экзамен выпускнікі школ, гімназій Маскоўскага раёна. Для праходжання ЦЭ сюды заявіліся 1967 выпускнікоў».

Паводле яго слоў, ва ўстанове адукацыі створаны ўсе ўмовы для камфортнай здачы выпрабаванняў, у тым ліку арганізавана дзяжурства медыцынскіх работнікаў: «Былі ў нас індывідуальныя запыты ў Дзяржкамісію, што датычацца дзяцей, якія маюць тыя ці іншыя хранічныя захворванні і для якіх трэба стварыць асаблівыя ўмовы. Гэта было выканана. Таксама тут забяспечаны пітны рэжым. Сёлетняе новаўвядзенне — у корпус, дзе праводзіцца цэнтралізаваны экзамен, нельга праносіць ніякія электронныя прылады. Таму арганізаваны збор мабільных і іншых электронных прылад».

Цэнтралізаваны экзамен у педуніверсітэце ў першы дзень здавалі школьнікі з 36 гімназій і школ Маскоўскага раёна сталіцы. Як адзначыў **рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК**, ва ўсіх 73 аўдыторыях усё было падрыхтавана і арганізавана: «Мы пастараліся стварыць для школьнікаў камфортныя ўмовы. Прадумана перамяшчэнне, усюды стаяць таблічкі і паказальнікі. Адшукаць аўдыторыі дапамагаюць нашы валанцёры-студэнты... Усё зроблена так, каб маладыя людзі паспяхова здалі цэнтралізаваны экзамен».

**Адказны сакратар Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам уступнай кампаніі ў 2025 годзе Дзмітрый МІРОНАЎ** расказаў, як забяспечваецца празрыстасць уступнай кампаніі: «Кантроль за яе правядзеннем ажыццяўляецца ў тры этапы. Першым крокам з'яўляецца стварэнне Дзяржаўнай камісіі па кантролі за працэсам, якая фарміруецца ўказам Прэзідэнта. Другі ўзровень кантролю ўяўляе сабой абласныя камісіі, якія ўзначальваюць старшыні абласных камітэтаў дзяржкантролю. На трэцім узроўні ў кожнай адукацыйнай установе, дзе праводзяцца ЦЭ і ЦТ, створаны спецыяльныя камісіі, якія звычайна ўзначальваюць члены Дзяржаўнай камісіі». Такім чынам, кожная адукацыйная ўстанова і пункт тэсціравання знаходзяцца пад уважлівым кантролем. Асноўная мэта — забяспечыць роўныя правы для ўсіх дзяцей пры здачы ўступных выпрабаванняў і залічэнні, а таксама аператыўна рэагаваць на любыя непрадбачаныя інцыдэнты».

ЦЭ сёлета здадуць больш за 56 тысяч выпускнікоў 11-х класаў. Пройдуць выпрабаванні ў 144 пунктах. Найбольш запатрабаванымі прадметамі сталі руская мова (яе выбралі больш за 46 тысяч выпускнікоў), матэматыка (амаль 19 тысяч навучэнцаў) і беларуская мова (тэст напішуць больш за 10 тысяч чалавек).

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БелТА.

### Абітурыенты сталіцы кажуць

Сярод тых, хто ўчора ў БДПУ здаваў першы ў сваім жыцці сур'ёзны экзамен, — **выпускнік сталічнай школы Мацвей.** Ён падзяліўся сваімі перажываннямі: «Хлусіць не буду: надзвычай хвалююча! Хоць, несумненна, рыхтаваўся ўвесь час вельмі старанна. У гэтым моцна дапамаглі мае настаўнікі. Страшна, цікава, але лічу, што маіх ведаў хопіць для таго, каб усё здаць паспяхова. Я мару паступіць у БДУІР на факультэт камп'ютарнага праектавання. Але таксама разглядаю як варыянт БНТУ, а менавіта інжынерныя прафесіі».

**Выпускніца сталічнай гімназіі Мілана** таксама перажывала з-за экзамену. Дзяўчына здавала біялогію, марыць паступіць у БДМУ. Яна расказала пра сваю падрыхтоўку да экзаменаў, падзялілася ўражаннямі: «Вельмі цікава, якія будуць заданні, таму што доўга рыхтавалася да гэтага, займалася на курсах, з рэпетытарамі. Я мару пайсці па шляху сваіх бацькоў — стаць сапраўдным урачом. Таму і выбрала для сябе менавіта БДМУ, бо, вядома, гэта перадавая медыцынская ВНУ краіны, у якой у свой час навучаліся мае бацькі. І, безумоўна, мне вельмі хочацца здаць усе ўступныя іспыты годна, каб паступіць туды, куды хачу, і працягнуць сямейную справу. Хвалююся, але вельмі спадзяюся, што ўсё атрымаецца».

### У тэму

## ЦЭ І ЦТ: ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ

**Цэнтралізаваны экзамен учора здавалі 56 778 адзінаццацікласнікаў**

Правядзенне цэнтралізаванага экзамену праходзіла ў суправаджэнні 8454 спецыялістаў. Не прысутнічалі на цэнтралізаваным экзамене 146 чалавек (у 2024-м — 149). Асноўныя прычыны — хвароба, удзел у спартыўных спаборніцтвах. У пункты ЦЭ не дапусцілі трох чалавек — у дзяцей не было з сабой пашпартоў. У 2024 годзе такіх было двое.

Па даных Міністэрства адукацыі, ад экзамену былі вызвалены 478 навучэнцаў. 302 з іх — навучаюцца дома, 176 — з'яўляюцца пераможцамі трэцяга і заключнага этапаў рэспубліканскай алімпіяды.



Фота БелТА.

### Гавораць абітурыенты (Брэст і Пінск)

**Данііл МЕЛЬНІЧУК, вучань 11-га кадэцкага класа СШ № 35 Брэста,** здаваў ЦЭ па гісторыі Беларусі ў сценах **Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта.**

Паводле слоў юнака, з тым, што ён будзе паступаць на гістарычны факультэт, вызначыўся яшчэ год таму, нават ва ўніверсітэцкай алімпіядзе ўдзельнічаў сёлета і заняў прызавое месца. А дысцыпліна і арганізаванасць, якія пануюць у кадэцкім класе, дапамаглі правільна размеркаваць час і добра падрыхтавацца да іспытаў.

— Заданні былі крыху больш складанымі, чым, напрыклад, на рэпетыцыйным тэсціраванні, але ў цэлым усё ў межах школьнай праграмы. Калі сеў за выкананне задання, зусім перастаў хвалявацца. І часу хапіла на ўсе пункты. Так што перад любым ЦЭ важна правільна настроіцца — і ўсё атрымаецца, — лічыць выпускнік.

**Аляксандр ПРАТАСЕВІЧ** скончыў Пінскі дзяржаўны аграрны тэхналагічны каледж некалькі гадоў таму. Учора здаваў ЦТ па матэматыцы ў **Палескім дзяржаўным універсітэце.** Хлопец не хавае свайго хвалявання, але ж спадзяецца, што напісаў добра:

— У каледжы я атрымаў прафесію, звязаную з тэхнічнай эксплуатацыяй абсталявання харчовай прамысловасці. Вучыцца было цікава. Яшчэ падчас вучобы нашы выкладчыкі настройвалі нас на тое, што варта працягваць адукацыю. Папрацаваў, паслужыў у арміі і вось «саспеў» для рашэння паступаць у ВНУ. Рыхтаваўся да іспытаў старанна, спадзяюся на добрыя вынікі.

### А што ў Гродне?

У галоўным корпусе **Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы** маладыя людзі ўчора таксама праходзілі цэнтралізаваны іспыт і цэнтралізаванае тэсціраванне. Журналісты папрасілі некаторых з іх падзяліцца планамі і адчуваннямі.

**Алеся ЛЯШКЕВІЧ, выпускніца Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў:**

— Планую паступаць у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Атрымала спецыяльнасць «Харэаграфічнае мастацтва», хачу звязаць сваю будучую дзейнасць са сферай спорту. Здаю сёння цэнтралізаванае тэсціраванне па гісторыі Беларусі, а 29 мая яшчэ буду здаваць рускую мову. Настрой у мяне добры, рыхтавалася разам з аднагрупнікамі, займалася з выкладчыкамі, рашала ЦТ мінулых гадоў. Мяркую, усё будзе добра, стараюся не хвалявацца, бо пазітыўны настрой спрыяльна ўплывае на вынік.

**Андрэй БОЛТРАЛЬ, вайсковец:**

— Здаваў ЦТ па фізіцы. Рашыў усе заданні недзе за 40 хвілін. Было нескладана, бо я старанна рыхтаваўся. Думаю, усё ў мяне добра атрымалася. Пасля школы я нікуды не паступаў, пайшоў служыць. Цяпер хачу паступіць на ваенны факультэт Купалаўскага ўніверсітэта, таму што вырашыў і далей будаваць кар'еру ў ваеннай сферы.

**Аляксандр МАСКАЛЕНКА, выпускнік Гродзенскага дзяржаўнага электратэхнічнага каледжа імя Івана Шчаснага:**

— Заданні на цэнтралізаваным тэсціраванні былі розныя. Нейкія былі лёгкія для мяне, нешта далося больш складана. Але ў цэлым, думаю, вынік будзе добры, бо падрыхтоўка ішла ўзмоцнена, і ў некаторых момантах была цяжэйшая, чым само выпрабаванне. Наперадзе яшчэ руская мова і матэматыка. Хачу паступіць у БНТУ на ваенна-тэхнічны факультэт. Вырашыў пайсці па шляху дзядулі, ён у мяне таксама быў вайскоўцам.

ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ

## PROАВІЯ — ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЎЛЮБЁНЫ Ў НЕБА

**У Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі прайшоў навукова-практычны фестываль інжынерных класаў авіяцыйнай накіраванасці**

У дзень адкрыцця PгоАВІЯ-2025 ва ўстанове адукацыі, дзе рыхтуюць будучых авіятараў, было асабліва шматлюдна. Акрамя студэнтаў акадэміі і дзяцей — вучняў інжынерных класаў авіяцыйнай накіраванасці, мерапрыемства наведалі і шматлікія госці: урачыстае мерапрыемства было запамінальным і кранальным. Афіцыйныя асобы шчыра пажадалі моладзі паспяховай работы не толькі на фестывалі, але і ў далейшым. Вучні інжынерных класаў і ўдзельнікі творчага аб'яднання акадэміі парадавалі яркімі і таленавітымі выступленнямі.



Праграма фестывалю была насычанай і ўключала ў сябе работу інтэрактыўнай пляцоўкі «Авіяцыя ва УАСА», секцый «Першыя крокі ў навуку», «Юныя знаўцы авіяцыі». Адбылося і пасяджэнне экспертнага круглага стала «Інжынерныя класы авіяцыйнай накіраванасці: вопыт і перспектывы». Запрошаныя госці і спецыялісты ў сферы адукацыі абмяркоўвалі дзейнасць профільных інжынерных класаў горада Мінска, іх вопыт і перспектывы, рэалізацыю праграмы факультатыўных заняткаў і іншыя тэмы. Вынікам пасяджэння стала падпісанне Дагавора аб супрацоўніцтве Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі з сярэдняй школай № 2 в. Копішча.

У гэты ж час удзельнікі секцыі «Першыя крокі ў навуку» дзвюх узроставых катэгорый — 5—9-я і 10—11-я класы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі абаранялі свае вучэбна-даследчыя работы. Аб тым, наколькі сур'ёзнай была дзейнасць секцыі, гавораць назвы праектаў даследаванняў — «Распрацоўка апарата для атрымання кіслароду з вуглякіслага газу пры дапамозе нізкатэмпературнай плазмы ва ўмовах атмасферы Марса», «Аналіз тэорыі паветранага руху. Аэрадынамічныя сілы, законы руху газаў», «Канструяванне і выраб лятучай мадэлі самалёта», «Прымяненне матэматычных разлікаў у авіяцыі» і іншыя. А навучэнцы секцыі «Юныя знаўцы авіяцыі» прайшлі квэст па тэрыторыі акадэміі, выконваючы творчыя заданні і ўдзельнічаючы ў інтэлектуальных гульнях.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота дадзена БДАА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

**Лот № 1.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (фундамент – бетон, площадь застройки – 71 кв. м, процент готовности – 12 %) по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Осиновка, ул. Полевая, 6А и земельный участок с кадастровым № 221287013101000145 площадью 0,1500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Осиновка, ул. Полевая. Ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Осиновское), охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): 4896,07 (2286,07/2610,00) бел. руб.

**Задаток:** 489,60 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 46,69 %.

**Реквизиты для внесения задатка по лоту № 1:** р/с: BY87 AKBB 3604 3141 0001 5200 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300977139, код операции 40901. Получатель платежа: Новкинский сельисполком.

**Лот № 2.** Не завершенный строительством законсервированный жилой дом с инв. № 200/U- 98423 (срок консервации истек) (фундамент – бетон, площадь застройки – 40 кв. м, процент готовности – 12 %) и земельный участок с кадастровым № 221282912101000026 площадью 0,1053 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в частную собственность по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Столбница, ул. Приозёрная, 2Б. Ограничения: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов (оз. Зароновское), площадь 0,1053 га.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **3334,06** (2014,44/1319,62) бел. руб.

**Задаток:** 333,40 бел. руб.

Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 60,42 %.

**Реквизиты для внесения задатка по лоту № 2:** BY14AKBB36043 140627462000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК банка: AKBBBY2X, УНП 300965239, код операции 40901. Получатель платежа: Зароновский сельисполком.

**Дата, время и место проведения аукциона: 11.06.2025 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

**Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 28.05.2025 до 17.30 10.06.2025.**

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия аукциона:** в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на зем. участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством. **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества:** – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.**

**Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ)**, которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

**Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**



**Признать недействительными** бланки строгой отчетности по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств формы ОГО серии МА № 9550960, НА № 5815017, НА № 5907873 в количестве 3 шт. представительства Белгосстраха по Червенскому району.

ТРЫ ПЫТАННІ ДА ЎЛАДЫ

# БЯРОЗА ТРЫМАЕ МАРКУ





Сёлета Бярозаўскі раён Брэсцкай вобласці адзначае 85-годдзе. Падарункам стала высокая ацэнка горада Бярозы: ён другі год запар — сярод найлепшых у краіне гарадоў з насельніцтвам да 50 тысяч па ўзроўні санітарнага стану і добраўпарадкавання. А ў Белаазёрска (другі па колькасці жыхароў населены пункт у раёне) ганаровая місія — прымаць абласныя «Дажынкі». Так што «трымаць марку» давядзецца ўсяму раёну, адзначыў старшыня Бярозаўскага раённага выканаўчага камітэта Вячаслаў МЯТЛІЦКІ, які адказаў на тры пытанні «Звязды».

***— Што з'яўляецца сёння візітоўкай Бярозаўшчыны, які яе ўнёсак у агульную скарбонку дабрабыту Беларусі?***

— Бярозаўскі раён — адзін з найбольш эканамічна развітых раёнаў Брэсцкай вобласці. Па аб'ёме прамысловай вытворчасці па выніках мінулага года мы дасягнулі амаль мільярда рублёў. А па ўзроўні заробкаў — трэція ў вобласці. Ёсць перспектыва для прыцягнення інвестыцый. Летась уведзена ў эксплуатацыю пікава-рэзервовая крыніца Бярозаўскай ДРЭС (адной з найбуйнейшых электрастанцый краіны) магутнасцю 258 МВт. У 2025 годзе плануецца пашырэнне лічбавага тэхнапарка ў Белаазёрску. Ідзе мадэрнізацыя на прадпрыемствах мяса-малочнай галіны. У нас развіты малы і сярэдні бізнес: працуюць 1349 індывідуальных прадпрымальнікаў, 255 мікра- і малых арганізацый, 16 суб'ектаў сярэдняга прадпрымальніцтва (іх падатковыя паступленні за 2024-ты склалі амаль палову раённага бюджэту). Бярозаўшчына на трэцім месцы ў вобласці і па колькасці гандлёвых аб'ектаў (больш за 800)...

Раён цікавы і сваёй гісторыяй: Бярозе праз пару гадоў споўніцца 540. Аб складаным мінулым нагадваюць рэшткі былога кляштара картэзіянцаў, захаваліся фрагменты старадаўняга сядзібна-паркавага комплексу Пуслоўскіх, адметныя храмы. Мы маем драматычны досвед існавання аднаго з першых у гісторыі чалавецтва канцлагераў — яго ў гэтых мясцінах стварылі польскія ўлады ў 30-я гады мінулага стагоддзя. Цяпер у яго колішніх сценах створана музейная экспазіцыя. Асаблівая ўвага ўдзяляецца помнікам баявой славы і ахвярам генацыду падчас Вялікай Айчыннай. Турыстаў вабіць і наша прырода: дзіўныя азёры і запаведнікі, культавы экафестываль «Спораўскія сенакосы»...

***— Бярозаўскі раён атрымаў права правесці сёлета абласныя «Дажынкі». Ці азначае гэта, што сельгаспрадпрыемствы раёна могуць быць прыкладам для іншых?***

— Раён сярод лідараў вобласці па вытворчасці многіх відаў сельгаспрадукцыі, у тым ліку жывёлагадоўчай. Па выніках мінулага года мы перасягнулі мяжу ў 8 тысяч кг па надоях малака на карову, што на 572 кг больш, чым у 2023-м. У нас 95 % малочных кароў размешчаны ў сучасных высокатэхналагічных малочнатаварных комплексах, якія забяспечваюць больш за 80 % малака гатунку «экстра». Гадавы аб'ём рэалізацыі малака перавысіў 110 тысяч тон з тэмпам росту 109,4 %. Гаспадаркі раёна здаюць на малакаперапрацоўчае прадпрыемства каля 24 літраў малака ад адной каровы штодзень.

Не адстае і раслінаводства: у 2024 годзе ўпершыню валавы збор збожжавых і зернебабовых культур склаў звыш 100 тысяч тон у бункернай вазе. Раён не першы год у прызёрах абласных спаборніцтваў па нарыхтоўцы травяных кармоў. Разлічваем дасягнуць больш высокіх паказчыкаў за кошт удасканалення тэхналагічных падыходаў. Гасцей «Дажынак» ёсць чым здзівіць і пачаставаць (мясцовай мясной, малочнай і іншай прадукцыяй харчовай галіны і сельгаспрадпрыемстваў). На Бярозаўшчыне спрадвеку захавалася асаблівая тэхналогія прыгатавання рыбы, сушанай у печы на саломе, — яна ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, як і мясцовая птушка-абярэг і яшчэ дзве народныя традыцыі. Чатыры рамеснікі ў нас маюць ганаровае званне «Народны майстар Рэспублікі Беларусь», а таму выбар мясцовых сувеніраў будзе годны. А жыхароў Белаазёрска, акрамя добраўпарадкавання вуліц, новых арт-аб'ектаў і графіці, чакае адкрыццё нядаўна ўзведзенага басейна.

***— Як, на вашу думку, заахвоціць моладзь жыць і працаваць на сваёй малой радзіме?***

— Сёння адна з ключавых задач — захаваць і прыцягнуць маладыя кадры для работы на розных прадпрыемствах раёна, прымацаваць іх да малой радзімы. Гэта значыць, яе вобраз павінен быць вельмі прывабным, каб была магчымасць рэалізавацца не толькі на рабоце, але і ў вольны час. Дзеля гэтага ў Бярозе сёлета збіраемся адкрыць комплекс для адпачынку каля гістарычных Чырвоных казармаў. Крэатыўная прастора павінна аб'яднаць творчых і актыўных людзей: у ёй плануецца арт-зона са сцэнай, пляцоўкі для варкаўта, стрытбола і скейтбордынга. Ідэі часта ідуць знізу, у тым ліку ад удзельнікаў Маладзёжнага парламента пры Бярозаўскім раённым Савеце дэпутатаў. Падчас сустрэч з моладдзю прадпрыемстваў і навучальных устаноў я пераконваюся, што яна ў нас неабыякавая — у гэтым аснова будучых поспехаў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Орбико Салон Профешнл»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1994 | Ноутбук HP 6F2C6EA 250 G9 + Клавиатура + мышь A4Tech KRS-8372, инв. №: 00000666; Ноутбук Levono 330-15ICH, инв. №: 00000524; Сервер Server HP ProLiant DL180 Gen9 E5-2620v4 SFF EU Svr/GO (Чехия), инв. №: 00000509 | 1 325,10 | 132,51 | 66,26 |
| 1995 | Торговое оборудование согласно списку № 2: https://orgtorg.by/upload/doc/orbiko-salon-profeshnl/1995.pdf | 1 848,00 | 184,80 | 92,40 |
| 1996 | Стеллаж для одежды и аксессуаров, ИмпАрт, инв. № 00000678 | 568,60 | 56,86 | 28,43 |
| 1997 | Куб Cube 40 Snow White пластиковый декоративный + RGB W2000 mAh Аккумуляторный LED модуль подсвет _1, инв. № 00000657 | 568,60 | 56,86 | 28,43 |
| 1998 | Куб Cube 40 Snow White пластиковый декоративный + RGB W2000 mAh Аккумуляторный LED модуль подсвет _2, инв. № 00000658 | 568,60 | 56,86 | 28,43 |
| 1999 | Вывеска зона кассы 1900x300x100, инв. № 00000635 | 133,27 | 13,33 | 6,66 |
| 2000 | Вывеска оргстекло 1900x450 мм, инв. № 00000636 | 75,27 | 7,53 | 3,76 |
| 2001 | Женский абстракт. манекен в полный рост G-06, белый, инв. № 00000661 | 97,57 | 9,76 | 4,88 |
| 2002 | Мужской абстракт. манекен в полный рост G-11, белый, инв. № 00000662 | 99,19 | 9,92 | 4,96 |
| 2003 | Промо-тумба 1600*1150*1000, лДСП 18 мм, белый, инв. № 00000645 | 111,60 | 11,16 | 5,58 |
| 2004 | Промо-тумба 2200*1800*450, лДСП 18 мм, белый, инв. № 00000644 | 268,20 | 26,82 | 13,41 |
| 2005 | Противокражная система, инв. № 00000632 | 203,40 | 20,34 | 10,17 |
| 2006 | Световой короб интерьерный тканевый 1400x1200x100, инв. № 00000663 | 147,60 | 14,76 | 7,38 |
| 2007 | Стеновая панель в зоне кассы, лДСП 18 мм, белый, наклеено полотно из меха, по торцам подсветка, инв. № 00000656 | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 2008 | Стойка с оргстеклом, ИмпАрт, инв. № 00000679 | 90,00 | 9,00 | 4,50 |
| 2009 | Тумба-стойка для аксессуаров 2700*1200, лДСП 18 мм, инв. № 00000642 | 357,60 | 35,76 | 17,88 |
| 2010 | Тумба-стойка для одежды 2700*1200, лДСП 18 мм, инв. № 00000643 | 282,00 | 28,20 | 14,10 |
| 2011 | ilo port для сетевого оборудования, инв. №: 00000567 | 32,35 | 3,24 | 1,62 |
| 2012 | Бесконтактный POS-терминал PAX A910 4G WiFi fiscal version, ПО «INPAS SOFT Unipos Droid», инв. №: 00000618 | 69,00 | 6,90 | 3,45 |
| 2013 | Беспроводная точка доступа HP E-MSM430, инв. №: 00000478 | 102,45 | 10,25 | 5,12 |
| 2014 | Беспроводная точка доступа WANFAR-221E-E, инв. №: 00000521 | 164,91 | 16,49 | 8,25 |
| 2015 | Беспроводная точка доступа Wi-fi Fortinet Indoor, инв. №: 00000566 | 72,51 | 7,25 | 3,63 |
| 2016 | Беспроводной сканер штрих-кода Mertech CL-610 BLE P2D USB черный, инв. №: 00000670 | 125,80 | 12,58 | 6,29 |
| 2017 | Вывеска на входной группе 2700x500x100, инв. №: 00000634 | 186,27 | 18,63 | 9,31 |
| 2019 | Инжектор для беспров.точки доступа 3*LANOOOGPI-115, инв. №: 00000523 | 25,36 | 2,54 | 1,27 |
